# МУЗЕІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ПАЛІТЫЧНАГА КРЫЗІСУ 2019–2022 ГГ.

## МЕЖЫ ПАЛІТЫЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ



BELARUS BEEHIVE

БАНК ИДЕЙ

ИССЛЕДОВАНИЕ ПОДГОТОВЛЕНО В РАМКАХ ПРОЕКТА BELARUS **BEEHIVE**, КООРДИНАТОР ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОЙ И ЭКСПЕРТНОЙ ЧАСТИ ПРОЕКТА ИНСТИТУТ «**ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА**»

# МУЗЕІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ПАЛІТЫЧНАГА КРЫЗІСУ 2019–2022 ГГ.

## МЕЖЫ ПАЛІТЫЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

BELARUS BEEHIVE

БАНК ИДЕЙ

Исследование подготовлено в рамках проекта Belarus Beehive, координатор исследовательской и экспертной части проекта – Институт «Палітычная сфера».

Исследовательские центры, участвующие в реализации исследовательской части проекта: Центр новых идей, Беларусский институт стратегических исследований, Центр европейской трансформации, Исследовательский центр BEROC, аналитический проект «Наше мнение», исследовательский центр CASE-Belarus, SYMPA.

2024

# ЗМЕСТ

Уводзіны ........................................................................4
Метады збору і аналізу інфармацыі ........................................6
Непалітычны змест: зніжэнне пры захаванні перавагі ...........10
Вялікая Айчынная вайна: новы рэнесанс .................................11
СССР: спробы актуалізацыі спадчыны......................................15
Дасавецкая гісторыя: спробы новай інтэрпрэтацыі ................17
“Грамадзянскасць” і “патрыятызм”...........................................21
Канструяванне “генацыду беларускага народа”.......................25
Трансфармацыя міжнароднага супрацоўніцтва.......................31
Непалітычныя выставы..............................................................35
Высновы ........................................................................40

# Уводзіны

Грамадска-палітычны крызіс у Рэспубліцы Беларусь, які пачаўся пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 г., значна паўплываў на ўсе сферы жыцця ў краіне. Шырокі грамадзянскі пратэст і масавыя палітычныя рэпрэсіі сталі найвялікшым узрушэннем у незалежнай гісторыі дзяржавы. Адным з наступстваў складзенай сітуацыі з'явілася павелічэнне знешняга ціску з боку Расіі, які ўзмацніўся з лютага 2022 г. пасля пачатку ваенных дзеянняў ва Украіне. У Беларусі актывізавалася палітыка русіфікацыі, значна звузілася сферы праяўленняў нацыянальнай самасвядомасці: многія з іх апынуліся пад забаронай і пераследаваліся.

Усе гэтыя абставіны непасрэдным чынам паўплывалі на ўмовы функцыянавання сферы культуры, на якую скіравалася пільная ўвага з боку ўладаў як на адну з плашчыняў супрацьстаяння дзяржавы і грамадства. Асабліва яскрава гэта тэндэнцыя праявілася ў адносінах да гістарычнай і культурнай спадчыны, якая стала адным з істотных фактараў самавызначэння для абодвух бакоў канфлікту. Раскол у адносінах да ўлады ў беларускім грамадстве карэлюецца з расколам у адносінах да гісторыка-культурнай спадчыны і гістарычнай памяці.

Музей як публічная ўстанова культуры, дзе прэзентуюцца адметнасці, традыцыі і дасягненні народа, з’яўляецца не толькі вузкаспецыялізаванай інстытуцыяй, але і фактарам, які ўздзейнічае на фармаванне культуры ў цэлым. Цэнтралізаванае рэгуляванне музейнай дзейнасці дае магчымасць уплываць на змену вобраза мінулага згодна з сучасным палітычным запатрабаваннем. Такім чынам, музейная сфера пасля падзей 2020 г. апынулася ў фокусе ўвагі ўладаў, якія імкнуцца манапалізаваць гістарычныя нарматывы. Вядома, што шырокамаштабныя палітычныя рэпрэсіі непасрэдным чынам праявіліся ў зменах у складзе штату музейных арганізацый, адкуль прыбіраліся нелаяльныя асобы[1]. Яшчэ на пачатку 2022 г. міністр культуры афіцыйна адзначаў мноства эпізодаў звальнення за «дэструктыўную пазіцыю» цягам папярэдняга года[2]. У музеях забаранілі працу староннім экскурсаводам[3]. Музеі робяцца своеасаблівай вітрынай, дзе рэпрэзентуецца запыт на фармаванне вызначанага вобраза мінулага.

**Мэта даследавання:** прасачыць працэсы, якія адбываліся ў дзейнасці музеяў у Беларусі да і пасля палітычнага крызісу 2020 года. Асноўная ўвага будзе нададзеная экспазіцыйнай дзейнасці, якая для музеяў з’яўляецца асноўнай. Мы паспрабуем зрабіць агляд і аналіз уплыву палітычных падзей 2019-2022 гадоў на музейны сектар у Беларусі праз фіксацыю змен у тэматыцы і колькасці экспазіцый. Неабходнасць правядзення даследавання была абумоўлена важнасцю ролі музея як індыкатара, які адлюстроўвае канфлікты ў сферы спадчыны і гістарычнай памяці Беларусі, што актуалізаваліся пасля прэзідэнцкіх выбараў і з пачаткам ваенных дзеянняў ва Украіне.



# Метады збору і аналізу інфармацыі

Аналізаваліся галіновыя музеі, падпарадкаваныя Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь. Яны складаюць абсалютную большасць музейных устаноў краіны і маюць значна большае значэнне, чым прыватныя і школьныя музеі. На канец 2022 г. у краіне функцыянавалі 157 ведамасных музеяў, з улікам філіялаў – 257[4], з якіх у адкрытых крыніцах была знойдзена інфармацыя пра 252 установы.

Для аналізу экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музеяў у разлік прымаліся рэгулярныя выставы, новаўведзеныя пастаянныя і часовыя экспазіцыі, электронныя выставы, а таксама кароткачасовыя музейныя пляцоўкі, якія складаліся са стэндаў з музейнымі прадметамі (або стэндаў і інтэрактыўных пляцовак) і дзейнічалі ад аднаго да некалькіх дзён.

**Часавыя межы** ахопліваюць перыяд з 2019 па 2022 год, дзе 2019 г. адлюстроўвае агульную сітуацыю перад прэзідэнцкімі выбарамі, а 2020-2022 гг. з'яўляюцца гадамі разгортвання палітычнага крызісу.

**Збор інфармацыі.** Асноўным метадам збору інфармацыі стаў маніторынг матэрыялаў адкрытых крыніц і занясенне атрыманых звестак у агульную базу дадзеных. Першую групу крыніц склалі афіцыйныя электронныя СМІ – спецыялізаваныя сайты музейных устаноў і Міністэрства культуры. Папярэдне меркавалася, што асноўным рэсурсам інфармацыі стане профільны партал Museum.by[5], які з'явіўся ў рамках праекта «Музеі Беларусі» ў 2009 г. на базе Нацыянальнага полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. У ходзе даследавання высветлілася, што ў супрацоўнікаў музейных устаноў не было абавязку рэгулярна запаўняць сваю старонку на Museum.by ці сайты музеяў. Некаторыя арганізацыі ўвогуле не публікавалі інфармацыю пра экспазіцыі. Дадатковай крыніцай аб электронных выставах паслужыў Віртуальны музей спадчыны краін СНД[6] на сайце Выканкама Садружнасці. Рашэнне аб яго стварэнні было прынята напрыканцы 2020 г. Звесткі аб выставах Міністэрства культуры даручала вывешваць толькі асобным музеям.

Такім чынам, для атрымання больш поўнай інфармацыі спатрэбіўся маніторынг сацыяльных сетак. Самымі папулярнымі платформамі з'яўляюцца Facebook, Instagram і VK. Высветлена, што, у адрозненне ад афіцыйных сайтаў, сацыяльныя сеткі абнаўляліся інтэнсіўней і на іх прадстаўлена больш разнастайнай інфармацыі[1]. У 2022 г. электронныя выставы пачалі ўносіцца ў зацверджаныя планы працы музея і часцей за ўсё яны выкладаліся менавіта ў сацсетках. Часам для атрымання дадатковай інфармацыі і ўдакладненняў у даследаванні выкарыстоўваліся звесткі з іншых дзяржаўных і недзяржаўных СМІ, напрыклад, калі з асноўных крыніц не была

---

[1] Аднак бываюць выключэнні, як, напрыклад, ДУК «Музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок»», дзе з канца 2019 г. запаўняўся выключна сайт Fartushok.by [7].

зразумела скіраванасць выставы (абвяшчалася толькі яе назва).

Усе выставы былі падзеленыя на 18 груп. Аднясенне да груп мае пэўную долю ўмоўнасці, паколькі часта для асобна ўзятай выставы можна абраць некалькі тэм. Агульная колькасць разгледжаных выстаў з 2019 па 2022 г. складае 6938 пазіцый. Акрамя аналізу тэматыкі, даследаванне дазволіла зафіксаваць іх дынаміку па гадах, у тым ліку змены ў палітыцы музеяў рознага профілю.

**Табліца 1.** Размеркаванне экспазіцый і выстаў музеяў Беларусі па тэмах, 2019-2022 гады

| Тэма | 2019 | 2020 | 2021 | 2022 | 2019-2022 |
|---|---|---|---|---|---|
| Мастацтва (любая творчасць) | 598 | 540 | 636 | 587 | **2361** |
| Вялікая Айчынная вайна | 121 | 186 | 214 | 199 | **720** |
| Гісторыя штодзённасці | 100 | 125 | 147 | 145 | **517** |
| Гісторыя СССР | 115 | 113 | 159 | 105 | **492** |
| Экалогія | 85 | 124 | 156 | 119 | **484** |
| Дасавецкая гісторыя | 97 | 100 | 135 | 123 | **455** |
| Краязнаўства | 83 | 82 | 100 | 134 | **399** |
| Патрыятызм, дзяржаўныя органы, дзяржаўныя святы | 37 | 39 | 60 | 63 | **199** |
| Рэлігія | 40 | 47 | 57 | 54 | **198** |
| Этнаграфія, фальклор | 28 | 57 | 66 | 44 | **195** |
| Беларуская мова і літаратура | 27 | 31 | 65 | 48 | **171** |
| Навука | 48 | 45 | 32 | 43 | **168** |
| Музейная дзейнасць | 27 | 37 | 31 | 30 | **125** |
| Міжнародныя тэмы | 35 | 19 | 35 | 33 | **122** |
| Генацыд беларускага народа | - | - | 4 | 113 | **117** |
| З’яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі | 2 | - | 39 | 49 | **90** |
| Расія | 13 | 11 | 24 | 33 | **81** |
| Спорт | 17 | 10 | 7 | 10 | **44** |
| **Агульны вынік** | **1473** | **1566** | **1967** | **1932** | **6938** |

Маніторынг дазволіў прасачыць наступную агульную тэндэнцыю. Запаўненне старонак у перыяд 2019-2020 гг. было нерэгулярным і відавочна не кантралявалася з боку афіцыйных уладаў. Да 2022 г. становішча мяняецца. У райвыканкамах увялі спецыяльныя пасады адказных за сістэмны маніторынг электронных рэсурсаў устаноў культуры. Музеі абавязалі публікаваць абвесткі пра дзяржаўныя святы і мерапрыемствы і дасылаць справаздачу ў Міністэрства культуры ў выглядзе спасылкі на такі пост. У плане дзейнасці пачалі зацвярджацца электронныя выставы, а іх колькасць павялічылася пасля пандэміі COVID-19. Такім чынам, інфармацыя аб экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці, даступная ў адкрытых крыніцах, стала найбольш поўнай і дакладнай у канцы перыяду даследавання. Гэтым жа тлумачыцца і агульна меншая колькасць выставак, зафіксаваных у 2019-2020 гг.

**Табліца 2.** Доля тэм у экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музеяў Беларусі, %

| Тэма | 2019 | 2020 | 2021 | 2022 | 2019-2022 |
|---|---|---|---|---|---|
| Мастацтва (любая творчасць) | 40.60 | 34.48 | 32.33 | 30.38 | 34.06 |
| Вялікая Айчынная вайна | 8.21 | 11.88 | 10.88 | 10.30 | 10.38 |
| Гісторыя штодзённасці | 6.79 | 7.92 | 7.47 | 7.51 | 7.44 |
| Гісторыя СССР | 7.81 | 7.22 | 8.08 | 5.43 | 7.09 |
| Экалогія | 5.77 | 7.92 | 7.93 | 6.16 | 7.01 |
| Дасавецкая гісторыя | 6.59 | 6.39 | 6.86 | 6.37 | 6.56 |
| Краязнаўства | 5.63 | 5.24 | 5.08 | 6.94 | 5.75 |
| Патрыятызм, дзяржаўныя органы, дзяржаўныя святы | 2.51 | 2.49 | 3.05 | 3.26 | 2.87 |
| Рэлігія | 2.72 | 3.00 | 2.90 | 2.80 | 2.85 |
| Этнаграфія, фальклор | 1.90 | 3.64 | 3.36 | 2.28 | 2.81 |
| Беларуская мова і літаратура | 1.83 | 1.98 | 3.30 | 2.48 | 2.45 |
| Навука | 3.26 | 2.87 | 1.63 | 2.23 | 2.42 |
| Музейная дзейнасць | 1.83 | 2.36 | 1.58 | 1.55 | 1.80 |
| Міжнародныя тэмы | 2.38 | 1.21 | 1.78 | 1.71 | 1.76 |
| Генацыд беларускага народа | 0.00 | 0.00 | 0.20 | 5.85 | 1.70 |
| З’яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі | 0.14 | 0.00 | 1.98 | 2.54 | 1.30 |
| Расія | 0.88 | 0.70 | 1.22 | 1.71 | 1.17 |
| Спорт | 1.15 | 0.64 | 0.36 | 0.52 | 0.63 |
| **Агульны вынік** | **100** | **100** | **100** | **100** | **100** |



# Непалітычны змест: зніжэнне пры захаванні перавагі

За ўвесь перыяд лідзіруюць выставы, прысвечаныя мастацтву, адлюстраваныя ў Табліцы 1 і 2 у катэгорыі «**Мастацтва (любая творчасць)**». У гэтую групу аб’яднаны ўсе выставы, прысвечаныя любой творчай дзейнасці: выяўленчае мастацтва, дэкаратыўнае, тэатральнае, музычнае і іншае, якія не маюць прывязкі да канкрэтнага гістарычнага перыяду ці грамадскай падзеі. Мастацкія выставы працягваюць складаць значную долю: 34.06% ад агульнай колькасць, або 2361 пазіцыя з 6938. Іх колькасць у 3,28 разу перавышае колькасць выстаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. Варта адзначыць, што ў 2020 г. назіралася заўважнае змяншэнне значэння мастацкіх выстаў з 40 да 30%. Тэматыка экспазіцый, аднесеных да гэтай групы, даволі разнастайная. У асноўным тут прадстаўлены аўтарскія выставы твораў выяўленчага, ужытковага і фотамастацтваў, у якіх дэманстраваліся ўніверсальныя сюжэты: пейзажы, партрэты і нацюрморты. Такім чынам, нягледзячы на складаную сітуацыю ў грамадстве і рэгіёне, асноўны прадукт музейнай дзейнасці заставаўся палітычна нейтральным. Аднак у 2022 г. назіраецца невялікае зніжэнне выстаў гэтай катэгорыі.

# Вялікая Айчынная вайна: новы рэнесанс

**Вялікая Айчынная вайна** з’яўляецца наступнай па пашыранасці тэмай. Агульная колькасць выстаў дадзенага кірунку склала 10.38%. Пасля падзей 2020 г. інтарэс дзяржавы да тэмы вырас, але не вельмі значна: з 8.21% у 2019 г. да 10.88% у 2021 г. Невялікае паніжэнне долі выстаў пра вайну (10.30%) у 2022 г. можна растлумачыць паралельным прасоўваннем блізкай тэмы «генацыду беларускага народа». У Беларусі замацавалася практыка выкарыстоўваць назву «Вялікая Айчынная вайна», выпадкаў выкарыстання азначэння «Другая сусветная вайна» знойдзена толькі два, абодва ў 2019-м[1].

Яшчэ да пачатку палітычнага крызісу Вялікая Айчынная вайна заставалася ўлюбёнай тэмай беларускай дзяржавы. З 2020 г. увага да яе ўзмацнілася яшчэ больш. Музей Вялікай Айчыннай вайны разам з Беларускай чыгункай распрацоўвае мабільную экспазіцыю «Перамога 75: дарогамі мужнасці і славы», якая некаторы час кур-

[1] Гэта «Украіна ў Другой сусветнай вайне 1939-1945» (адкрылася ў красавіку 2019 г.), «Память о Победе. Награды Второй мировой войны» (з ліпеня 2019 г.).

сіруе па краіне. Яе змяняе ў чэрвені 2021 г. перасоўны «музей на колах» «Цягнік перамогі», арганізаваны сумесна з расійскім бокам. За крытыку гэтага мерапрыемства ў сацсетках была заведзена крымінальная справа за «абразу памяці подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне»[8]. У 2022 г. запушчаны ўжо дзве мабільныя экспазіцыі: «Дарога памяці» і «Мы разам па дарозе памяці». З 2022 г. зрабілі бясплатны ўваход у дзяржаўныя музеі ў дні 8-9 траўня. У тым жа месяцы пачалося будаўніцтва новых карпусоў музея ў Хатыні для пашырэння экспазіцыйных плошчаў[9].

Зразумела, што Вялікая Айчынная вайна не з'яўляецца профільным кірункам для большасці беларускіх музеяў. Па стане на 2022 г. у краіне са 157 музеяў налічвалася толькі 6 ваенна-гістарычных. Акрамя іх адпавядаюць кірунку два мемарыяльныя комплексы: Хатынь і Брэсцкая крэпасць. Вялікая колькасць выстаў тлумачыцца пільнай увагай беларускіх уладаў да тэматыкі, якая непасрэдна звязана з культам перамогі, моцнай дзяржавы, стварае апірышча для патрыятычнага выхавання моладзі. Тэма з'яўляецца планавай, гістарычныя і краязнаўчыя музейныя ўстановы абавязаны яе рэалізоўваць. Тэматыка «Вялікай Айчыннай вайны» адсутнічае толькі ў экспазіцыйнай дзейнасці прыродазнаўчых музеяў. У палацава-паркавых комплексах назіраецца паніжэнне колькасці ваенных выстаў у 2021-2022 гг., але гэта відавочна тлумачыцца пашырэннем тэмы генацыду беларускага народа.

Канкрэтызацыя таго ці іншага спосабу выказвання пра ваенныя падзеі дагэтуль застаецца ў юрысдыкцыі супрацоўнікаў музея. Да неабходнасці пераасэнсавання і дыялогу паміж пакаленнямі заклікала фотавыстава «Пакаленне міру аб вайне і міры» (з мая 2019 г.). У Брагінскім гістарычным музеі 29 мая 2020 г. з'явілася выстава «Postscriptum: усходнія рабочыя ў Трэцім Райху», якая



**Мал. 1.** Экспанаты выставы «Вайна вачыма мастакоў» дэманструюць выкарыстанне дастаткова нейтральных мастацкіх сюжэтаў

расказвала аб прымусовых працах у Германіі, акцэнтуючы лёс людзей. Выставы, якія прадстаўляюць вайну як крыніцу чалавечых пакут, засталіся і ў 2022 г. Напрыклад, «Ваеннае дзяцінства» – у Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку з 30 красавіка 2022 г.

Вялікая частка выстаў мае адносна нейтральны характар, распавядаючы пра штодзённасць ваеннага часу. Гэта экспанаванне прадметаў побыту, узнагарод, рэканструкцыя партызанскага жыцця. Віртуальная выстава «Іпасфера Вялікай Айчыннай вайны» (з 9 мая 2020 г.) складаецца з фотапейзажаў з вайсковымі коньмі. На выставе «І песня таксама ваявала…» (з 2 ліпеня 2021 г.) дэманстраваліся патэфоны, старыя кружэлкі, зборнікі вайсковых песень. Выстава «Партрэт сям'і ў інтэр'еры часу» (з 13 мая 2022 г.) мае дастаткова пазітыўную афарбоўку, распавядае пра сем'і, якія ствараліся падчас вайны і пасля перамогі. Таксама папулярнымі застаюцца аўтарскія і калектыўныя зборы твораў мастацтва, дзе звычайна прадстаўлены

разнастайныя сюжэты, так ці інакш звязаныя з вайной: «Вайна вачыма мастакоў» (з 5 мая 2021 г.) (Мал. 1), жывапіс Л. Шчамялёва «Салют Радзіме» (з 6 мая 2020 г.) і інш.

З 2021 г. на святочных мерапрыемствах усё часцей сталі з'яўляцца кароткія, часта аднадзённыя музейныя рэканструкцыі, якія маюць на мэце пагружэнне наведвальніка ў гісторыю вайны, як, напрыклад, «Салдацкі прывал» (9 мая 2022 г.). Найбольшы акцэнт на гераічным складніку ваенных дзеянняў назіраецца ў выставах, звязаных з вызваленнем таго ці іншага рэгіёна ці паселішча або з персанальнымі ці калектыўнымі подзвігамі. Гэта такія выставы, як «Полацк 1944» (з 9 мая 2021 г.) і «Аляксей Бацян – легендарны разведчык» (з 17 лютага 2022 г.). Таксама можна адзначыць, што пасля нападу Расіі на Украіну з'яўляюцца адзінкавыя спробы экстрапаліраваць мінулую вайну на сучаснасць, што праяўляецца, напрыклад, у такой двухсэнсоўнай назве відэавыставы на сайце музея ВАВ: «Саюз народаў – залог Перамогі» (канец 2022 года).

# СССР:
# спробы актуалізацыі спадчыны

Гісторыя СССР застаецца дастаткова папулярнай на працягу ўсяго перыяду. Яна паволі пашыраецца з 7,81% у 2019-м да 8,08% у 2021 годзе, але ў 2022 г. выстаў становіцца крыху менш: 5.43%. Значную частку экспазіцый складаюць зборы прадметаў, выробленых у савецкі час: паштовак, цацак, рэтратэхнікі і інш. Часта такія выставы прымяркоўваюцца да савецкіх свят, такіх як Дзень касманаўтыкі або 23 Лютага. Ёсць асобныя выставы, прысвечаныя камсамолу і піянерыі. Напрыклад, 19 мая 2022 г. у Чашніках адкрылася выстава «Піянерскі куток» – да 100-годдзя арганізацыі.

Многія музеі і да, і пасля палітычнага крызісу ў лютым прысвячалі выставу гадавіне вываду савецкіх войск з Афганістана. Напрыклад, 15 лютага 2019 г. адкрылася выстава да 30-годдзя падзеі «Ім вечнасць працягне руку». Таксама да тэматыкі СССР адносяцца выставы, якія паказваюць жыццё рэгіёна ў савецкі час, такія як «Полацкі фотаальбом. 1950-я гады. Са збораў музея» (з 19 лістапада 2020 г.). Па сутнасці, яны прысвечаны краязнаўству і звычайна з’яўляюцца дастаткова нейтральнымі. Да га-

давіны знакавых вехаў савецкай дзяржавы спецыяльныя выставы традыцыйна праводзяць гістарычныя і ваенныя музеі. У лістападзе 2019 г. у Ваенна-гістарычным музеі ім. Д. К. Удавікова адкрылася «Выстава аб Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі». Чашніцкі гістарычны музей 6 лістапада 2021 г. запусціў выставу «1917. Кастрычнік, рэвалюцыя...». Савецкая спадчына паэтызуецца і прадстаўляецца толькі ў пазітыўным святле. У Любанскім музеі народнай славы 20 снежня 2022 г. адкрылася выстава «Страна мечтателей, страна героев», прымеркаваная адначасова да 100 годдзя ўтварэння СССР і 85-годдзя Мінскай вобласці.

# Дасавецкая гісторыя: спробы новай інтэрпрэтацыі

Наступная даволі пашыраная тэматыка – **дасавецкая гісторыя**. Агульная лічба за ўсе гады склала 455 пазіцый з 6938, або 6,56%. Колькасць выстаў гэтай катэгорыі павялічылася ў абсалютных лічбах з 97 у 2019 г. да 123 – у 2022 г., аднак доля крыху зменшылася: з 6,59% да 6,37% адпаведна. У першую чаргу выставамі гэтай катэгорыі займаецца корпус профільных установаў: музеі-сядзібы, археалагічныя музеі, а таксама палацава-паркавыя комплексы і замкі. За разгледжаны перыяд у палацава-паркавых комплексах колькасць выстаў на тэматыку дасавецкай гісторыі знізілася з 32 у 2019 г. да 24 у 2022 г. З 3 да 11 пазіцый павялічылася колькасць выстаў у мастацкіх музеях і з 2 да 6 – у літаратурных. У гістарычных і краязнаўчых музеях колькасць таксама вырасла з 49 да 72 адпаведна, але доля не змянілася (5,31% супраць 5,33%).

Перыяд ранняй гісторыі прадстаўлены экспазіцыямі археалагічных артэфактаў ці рэканструкцый прадметаў. Гэта такія выставы, як «Ахоўная зброя сярэднявечнай Беларусі» (з 18 студзеня 2019 г.), «Касцярэзнае рамя-

ство Полаччыны ў прадметах археалогіі IX-XIX стст.» (з 7 жніўня 2020 г.), «Гісторыя аднаго чалавека. XI стагоддзе» (з 24 снежня 2020 г.), калекцыя рэканструяваных прылад катавання «Паляванне на ведзьмаў» (з 8 снежня 2021 г.), «Нараджэнне і смерць. Зарубінецкая культура» ў супрацы з Эрмітажам (з 2 снежня 2022 г.).

На працягу ўсіх гадоў сустракаюцца выставы, прысвечаныя перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Звычайна гэта экспазіцыі тагачасных прадметаў, традыцый і культуры. Напрыклад, выстава 2019 г. «Ацалелыя і неацалелыя палацы роду князёў Агінскіх», прымеркаваная да 75-годдзя Гродзенскай вобласці. Можна заўважыць адрозненні па гадах у выкарыстанні самой назвы перыяду, трактаванні гістарычных падзей і ролі знакавых асоб у іх. Цікава, што калі ў 2019-2021 гг. яшчэ былі магчымыя выставы з назвамі «Вялікае Княства Літоўскае. Артэфакты гісторыі» (з 2 кастрычніка 2019 г.) і «Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага ў асобах» (выстава карцін, адкрылася 12 лістапада 2021 г.), то ў 2022 г. такая канкрэтная прывязка да перыяду не выкарыстоўваецца.

Сярод мерапрыемстваў 2019 г. можна знайсці выставу «Вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі», арганізаваную Польскім Інстытутам да 450-годдзя падпісання Люблінскай уніі. Выстава мела яўную скіраванасць на ўсталяванне добрасуседскіх зносін Беларусі і Польшчы. 15 студзеня 2019 г. адкрываецца выстава «За волю, незалежнасць, свабоду. Да 225-годдзя паўстання Т. Касцюшкі». З 2022 г. такога роду сюжэты знікаюць цалкам.

У гэтым кантэксце варта прыгадаць выступленне 6 студзеня 2022 года А. Лукашэнкі, на якім было прамоўлена пра неабходнасць пераацэнкі перыядаў Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай. Апошні быў ахарактарызаваны як акупацыя беларускіх земляў і нават «этнацыд белару-

саў»[10]. У выніку на працягу года прайшоў шэраг зачыстак музейных экспазіцый. У Ашмянскім краязнаўчым музеі быў зняты штандар мясцовай «школкі Пілсудскага». У Нацыянальным гістарычным музеі прыбралі скульптуры вялікага князя Вітаўта і караля Ягайлы, якія знаходзіліся ў экспазіцыі з 2011 г.[11].

Паказальны выпадак здарыўся з полацкім Музеем кнігадрукавання, на старонках якога ў пачатку 2023 г. была запушчана электронная выстава да 450-годдзя Акта Варшаўскай Канфедэрацыі аб верацярпімасці ў Рэчы Паспалітай. У хуткім часе ў музеі прайшлі масавыя арышты супрацоўнікаў. Верагодна, выстава не была галоўнай прычынай, але прынамсі адной з шэрагу іншых.

Такім чынам, з 2022 г. застаюцца нешматлікія, ускосна звязаныя з Рэччу Паспалітай выставы, дзе адлюстроўваецца нейтральная тэматыка штодзённасці ці культуры. Напрыклад, 30 чэрвеня 2022 г. пачала працу літаратурна-мастацкая экспазіцыя ««Катэхізіс» Сымона Буднага ў сучасным асэнсаванні. Да 460-годдзя выдання». З 17 лютага 2022 г. адкрылася мастацкая выстава «Леў Сапега. Узор беларускага палітыка. Да 465-годдзя нараджэння».

Можна адзначыць, што колькасць выстаў, прысвечаных перыяду Расійскай імперыі, павялічылася зусім нязначна: з 7 у 2019 г. да 12 у 2022 г. Гэта расповеды пра царскую сям'ю, вайну з Напалеонам, калекцыі тагачасных прадметаў.

Ва ўсе гады зусім мала адлюстроўваецца перыяд знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Вялікая разнастайнасць сюжэтаў унутры гэтай падкатэгорыі назіраецца ў 2022 г. 3 ліпеня ў Дзяржынску адкрываецца пляцоўка-рэканструкцыя «Местачковы базар 1930-х гг.», пачынае працу перасоўная выстава «Ты з Заходняй, я з Усходняй…», прысвечаная сацыяльна-эканамічнаму

і культурнаму развіццю Заходняй Беларусі пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы. А ў верасні ў Бярозаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі ўзнікае новая экспазіцыя «Канцлагер Бяроза-Картузская 1934-1939 гг.», якая складаецца з трох залаў: фотаэкспазіцыйны, карцар, камера. Выставы пра гэты канцлагер з'яўляюцца ўпершыню ў 2021 г.

# “Грамадзянскасць” і “патрыятызм”

**«Грамадзянскасць», «патрыятызм», гісторыя дзяржаўных органаў і дзяржаўныя святы**, згрупаваныя разам у адну катэгорыю, склалі за ўвесь час 199 пазіцый, або 2,87% ад агульнай колькасці выстаў. Іх колькасць павялічылася з 37 у 2019 г. да 63 у 2022 г., што адпаведна складае 2.51% і 3.26%. Пры гэтым паміж 2020 і 2021 гг. адбыўся скачок з 39 да 60 пазіцый.

Тэматыка адсутнічае ці практычна адсутнічае ў прыродазнаўчых музеях, палацава-паркавых комплексах, літаратурных музеях, слаба праяўлена ў мемарыяльных комплексах і мастацкіх музеях (4 разы). Часцей за ўсё сустракаецца ў краязнаўчых і гістарычных музеях – вырасла з 29 да 59 пазіцый да 2022 г.

Канкрэтызаваныя тэмы не асабліва адрозніваліся на працягу ўсіх гадоў. У асноўным гэта дастаткова аднатыпныя выставы, прысвечаныя Дню незалежнасці, Канстытуцыі, гербу і сцягу, прафсаюзнаму руху, узброеным сілам і МНС, іншым дзяржаўным структурам, працоўным подзвігам, сельскай гаспадарцы і г.д. У ліпені 2020 г., напярэдадні выбараў, адбываецца выстава тэматычных

плакатаў «Сапраўдныя каштоўнасці», прызначаных для папулярызацыі духоўных каштоўнасцяў і традыцый беларускага народа. У 2021 г. шэраг выстаў з гэтай катэгорыі атрымаў прысвячэнне да «Года народнага адзінства».

Многія выставы атрымліваюць старыя савецкія загалоўкі. Напрыклад, 7 мая 2021 г. адкрылася выстава «Взывая к священному долгу», прымеркаваная да дня прыняцця школьнікаў у піянеры. З 2021 г. сустракаюцца выставы, дзе падкрэсліваецца сяброўства з Расіяй: «Дзве сястры – Беларусь і Расія» (з 2 красавік 2021 г.). Пры гэтым у 2022 г. запускаюцца перасоўныя экспазіцыі з наратывам самастойнасці: «За Беларусь» і «Незалежная Беларусь».

У катэгорыю «**Этнаграфія, фальклор**» уключаны выставы, звязаныя з традыцыйнымі беларускімі рамёствамі, святамі і абрадамі. Шэраг экспазіцый наўпрост паказвае музейныя прадметы (выстава «Ручнік з купальскім дубам. Дубраўская традыцыя ў ткацтве»), іншыя прысвечаны пераасэнсаванню і аналізу аўтэнтычнай традыцыі («На асіне сяджу, скрозь клён гляджу, бярозу трасу… Код ткацтва ў яго семіятычным ракурсе»). Катэгорыя характарызуецца нязменнасцю сюжэтаў на працягу перыяду. У 2022 г. усё гэтак жа адбываюцца выставы накшталт «Відзікі: беларускі традыцыйны роспіс на шкле» або «Традыцыйны народны тэкстыль Гродзеншчыны». Колькасць выстаў вырастае з 28 у 2019 г. да 66 у 2021 г., а ў 2022 зніжаецца да 44. Агульная доля складае 2,81%.

Выставы, прысвечаныя тэме «**Беларуская мова і літаратура**», у асноўным сустракаюцца ў профільных літаратурных музеях, дзе іх колькасць вырасла з 12 да 22 у 2022. Таксама вялікая частка выпадае на долю краязнаўчых і гістарычных музеяў: па гадах гэта 8, 13, 23 і 16 разоў адпаведна, што складае 9-14% ад агульнага аб’ёму выставачнай дзейнасці музеяў гэтага тыпу. Адзінкавыя

выпадкі сустракаюцца ў мастацкіх музеях і палацава-паркавых комплексах. Агульная лічба выстаў складае 170, або 2,45%.

Дадзеная катэгорыя ў асноўным прадстаўлена выставамі, прысвечанымі дзейнасці і спадчыне прадстаўнікоў беларускай мастацкай літаратуры або кнігадрукаванню. Экспазіцыі прымяркоўваюцца да юбілеяў аўтараў, Міжнароднага дня роднай мовы, Дня беларускага пісьменства. Такой з'яўляецца выстава «Служэнне роднаму слову», прысвечаная пісьменнікам-юбілярам 2019 г. Заўважная частка выстаў адносіцца да дзейнасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, І. Шамякіна. Аўтары, якія не з'яўляюцца станоўчымі для ўладаў, не прысутнічалі ў экспазіцыях і ў 2019 г. Аднак да выбараў 2020 г. яны заставаліся ўмоўна дапушчальнымі ў музеях. 30 мая 2019 г. у Літаратурным музеі Петруся Броўкі адбылася тэатралізавана-інтэрактыўная падзея «Ларыса Геніюш – у пошуках сапраўднага Мужчыны», а 31 студзеня 2020 г. праходзілі чытанні вершаў Н. Арсенневай. У пазнейшы час такіх прэцэдэнтаў не здаралася.

Да пачатку 2022 г. праводзіліся выставы, звязаныя з імёнамі рэпрэсаваных савецкай уладай літаратараў. У музеі П. Броўкі 5 лістапада 2019 г. адкрылася выстава «Адлюстраванні», прысвечаная Алесю Дудару (Мал. 2). Плённым у гэтым сэнсе выглядаў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. У 2019 г. у ім прайшоў шэраг фізічных і віртуальных экспазіцый: выстава да 110-годдзя з дня нараджэння Лукаша Калюгі, беларускага пісьменніка, рэпрэсаванага ў 1937 г., выстава да 115-годдзя з дня нараджэння (6 красавіка) Міколы Хведаровіча, вязня ГУЛАГу, выстава да дня нараджэння Алеся Дудара. 23.11.2021 г. тут адкрылася літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Залатая раніца беларускага Адраджэння» – 1920-1930-я., прымеркаваная да 110-годдзя Юлія Таўбіна, 115-годдзяў Андрэя Александровіча




**Мал. 2.** Афіша выставы “Адлюстраванні”, прысвечанай Алесю Дудару

і Алеся Салагуба, 120-годдзяў Міхася Зарэцкага і Віталя Вольскага, 125-годдзяў Кандрата Крапівы, Майсея Кульбака, Міхася Чарота, 135-годдзя Змітрака Бядулі. У 2022 г. выставы, прысвечаныя рэпрэсаваным творцам, адсутнічаюць, як і выставы пра В. Быкава.

Сустракаюцца сінкрэтычныя тэмы, дзе спалучаецца творчасць і іншы кірунак, напрыклад вайна. У 2022 г. працавала выстава «Шчаслівых перамог, свабодны мой народзе», дзе паэзія Я. Купалы разглядалася ў кантэксце падзей Вялікай Айчыннай вайны. Гэтую выставу было вырашана аднесці да катэгорыі літаратуры, таму што галоўны акцэнт тут заставаўся менавіта на спадчыне выбітнага творцы.

# Канструяванне "генацыду беларускага народа"

Адным з самых яскравых адлюстраванняў сучаснай палітыкі беларускай дзяржавы і яе ўплыву на эспазіцыйна-выставачную дзейнасць музеяў стала з'яўленне і каласальна хуткі рост колькасці выстаў, прысвечаных тэме «**Генацыд беларускага народа**». У 2019-2020 гг. яны цалкам адсутнічаюць, у 2021 г. праходзіць 4 выставы (0,20%), а ў 2022 – адразу 113 (5,8%). Усяго адбылося 117 выстаў, што склала 1,7% ад агульнай лічбы. Гэта вельмі высокі паказнік для тэматыкі, нядаўна сканструяванай беларускай дзяржавай у імкненні падкрэсліць пагрозу з боку заходніх краін і пераняць ролю ахвяры, якая і ў наш час знаходзіцца ў небяспецы. Спецыфічнае вызначэнне «генацыд беларускага народа» абазначае мэтанакіраванае вынішчэнне ўсіх беларусаў як нацыі нямецкімі войскамі і іх хаўруснікамі, якое нібыта адбывалася ў часы Другой сусветнай вайны.

Названая катэгорыя пасунула тэму Халакосту, распусціла яе ў сабе, як і ў савецкія часы, але на гэты раз з мэтай падкрэсліць трагічны лёс менавіта беларускага народа. Афішам выстаў надаваўся характэрны драма-

тычны характар, часта з выкарыстаннем выяў пакут дзяцей (Мал. 3).

Пры размеркаванні выстаў па музеях рознага профілю найбольшая колькасць відавочна прыпадае на гістарычныя і краязнаўчыя музеі. Гэта ўсе 4 выставы 2021 года і 84 – у 2022-м. У палацава-паркавых комплексах адбылося 11 выстаў, у мастацкіх музеях – 3, у аб’яднаных – 9, на мемарыяльных комплексах – 2, у прыродазнаўчых такія адсутнічаюць, а астатнія тыпы музеяў правялі па 1 выставе (усё гэта прыпадае на 2022 г.). Адбыўся абсурдны выпадак, калі ў Ашмянскім краязнаўчым музеі для правядзення выставы «Без тэрміну даўніны» (з 1 красавіка 2022 г.), прысвечанай расследаванню крымінальнай справы генацыду беларускага народа, знялі папярэднюю доўгатэрміновую фотавыставу аб Халакосце.

Паводле колькасці выстаў, прысвечаных генацыду ў 2022 г., бачна, што іх правялі 117 музеяў са 157-мі: тэма была абавязковай да выканання. Адзначыліся




**Мал. 3.** Афіша часовай экспазіцыі Віцебскага краязнаўчага музея «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны»

нават тыя ўстановы, дзе звычайна амаль няма зменнай выставачнай дзейнасці. Напрыклад, «Камянецкая вежа», дзе 15.03.2022 г. адкрылася выстава «Забыццю не падлягае».

Як і ў выпадку з асвятленнем планавых тэматык пра Вялікую Айчынную вайну ці ўз'яднанне Беларусі, тут таксама захоўвалася некаторая магчымасць выбару музеем канкрэтнага ракурсу асвятлення тэмы, якая магла падавацца з трагічна-патрыятычным пафасам або са смуткам як распавед-рэквіем. 27 студзеня 2022 г. адкрылася выстава да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту, якая пры гэтым фармальна адносілася да выстаў пра генацыд беларускага народа. Слуцкі краязнаўчы музей справаздачыўся выставай твораў выяўленчага мастацтва і скульптуры «Памяць пакаленняў» (з 03.06.2022 г.), а Нацыянальны мастацкі музей – зборнай выставай жывапісу «Ніколі больш» (з 29.04.2022 г.)[12].

Звычайна працягласць экспанавання тэматычнай выставы абмяжоўвалася адным месяцам. Аднак некаторыя ўстановы стварылі ўрэшце не часовыя, а пастаянныя экспазіцыі. Такая з'явілася ў Музеі Вялікай Айчыннай вайны. У Валожынскім краязнаўчым музеі з 01.02.2022. адкрылася экспазіцыя «Генацыд – наша памяць і боль…». 08.04.2022 г. у Цэнтры гісторыі і культуры Акцябрскага раёна пачала працу рээкспазіцыя «Генацыд без тэрміну даўніны…». Урачыстае адкрыццё і часовых выстаў, і экспазіцый звычайна адбывалася з удзелам прадстаўнікоў мясцовых уладаў, дзяржаўнай прэсы, а таксама супрацоўнікаў пракуратуры, якой, як правіла, належала большая частка дэманстраваных артэфактаў, фотаздымкаў і дакументаў. Напрыклад, пастаянная экспазіцыя Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея «Памяці ахвяраў генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (з 12.03.2022 г.) была створана «па ініцыятыве пракуратуры Пухавіцкага раёна».

Напрыканцы 2022 года праводзіліся абласныя конкурсы на найлепшую музейную экспазіцыю, прысвечаную ахвярам генацыду беларускага народа. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці перамаглі Клічаўскі краязнаўчы, Глускі гісторыка-краязнаўчы і Шклоўскі гісторыка-краязнаўчы музеі. Цікава, што на старонках Шклоўскага музея не было справаздачы пра тэматычную выставу. Клічаўскі музей быў уганараваны за новую экспазіцыю «Памяць без тэрміну даўніны» (з 09.12.2022 г.).

Выставы, прысвечаныя тэматыцы **«З'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі»** (за трыма выключэннямі ў 2021 г.), у ранейшы перыяд адбываліся ў жніўні-кастрычніку, то бок прымяркоўваліся мэтанакіравана да гадавіны падзеі. Аднак ужо з 2022 г. гэта правіла знікае. З'яўляюцца перасоўныя тэматычныя выставы «За Беларусь. 17 верасня – Дзень народнага адзінства» і «Ты з Заходняй, я з Усходняй», якія, пераязджаючы з музея ў музей, адкрываюцца ў любы час года. Напрыклад, 2 лютага ў расонскім Музеі баявой садружнасці пачала працу фотадакументальная выстава «За Беларусь. 17 верасня – Дзень народнага адзінства». 30 красавіка выстава «Ты з Заходняй, я з Усходняй» адкрываецца ў Мядзельскім музеі народнай славы. Звычайна гэтыя выставы доўжацца 1 месяц. Такое пашырэнне ахопу тлумачыцца тым, што 2021 г. быў аб'яўлены ў Беларусі Годам народнага адзінства, а 17 верасня прызначалася адпаведнай памятнай датай.

Для ўзмацнення вобразу варожага калектыўнага Захаду найперш выкарыстоўвалася павышэнне негатыўнага стаўлення да найбліжэйшай да нас буйной краіны ЕС – Польшчы. Адпаведна, усе перыяды знаходжання з ёй у адной дзяржаве прапанавана трактаваць як акупацыю. Аднак курс на адназначна антыпольскія настроі быў узяты не адразу. У 2019 г. адбылося толькі 2 выставы на тэму ўз'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі, абедзве

былі прымеркаваныя да вераснёўскіх угодак і не мелі антыпольскага характару. Гэта выставы «1939: год пераломных падзей» у Нясвіжскім гісторыка-краязнаўчым музеі і дакументальны праект гісторыка І. Мельнікава «Мяжа была пад Мінскам, 1921-1941 гг.». Апошні пачаў працу з 17 верасня ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы і адлюстроўваў складаную гісторыю міжваеннай польска-савецкай мяжы ў Беларусі. У тым ліку расказвалася пра дыверсійныя групы і канцэнтрацыю савецкіх войскаў побач з кардонам напярэдадні пачатку Другой сусветнай. Складна сказаць чаму, аднак у 2020 г. не зафіксавана ніводнай выставы на тэму ўз'яднання Беларусі. Магчыма, супрацоўнікі музея палічылі немэтазгодным уздымаць настолькі кантраверсійную тэму ў актыўнай фазе пратэстаў.

Сітуацыя кардынальна змянілася ў 2021 г. Было зафіксавана 39 тэматычных выстаў і экспазіцый (1,98% ад агульнай колькасці за год), а ў 2022 г. лічба вырасла да 49 пазіцый (2,54%). Такім чынам, сумарная колькасць за ўвесь перыяд склала 90 выстаў, або 1,30%. Пры гэтым на часы да выбараў 2020 года прыпадае толькі 2 вядомыя выпадкі. Высокія паказнікі забяспечваюць не толькі адзінкавыя музейныя выставы, але і перасоўныя, і кароткатэрміновыя. У 2021-2022 гг. на гарадскіх мерапрыемствах, якія праводзяцца ў Дзень народнага адзінства, заўжды працуюць экспазіцыйныя музейныя пляцоўкі, як, напрыклад, пляцоўка «Уз'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі» ў Пінску на базе ДУ «Музей Беларускага Палесся». Калі казаць пра размеркаванне па ўстановах паводле іх асноўнага профілю, то тэматычныя выставы не праходзілі ў прыродазнаўчых музеях, мемарыяльных комплексах і музеях архітэктуры і фальклору. Па 1 выставе ў 2019 і 2021 гг. адбылося ў літаратурных музеях. Пераважная колькасць выстаў выпадае на музеі гістарычнага і краязнаўчага профілю: 1 пазіцыя ў 2019 г., 30 – у 2021 г., 37 – у 2022 г.

У верасні 2022 г. у Баранавічах адкрываецца новы, першы ў краіне «Музей народнага адзінства» з экспазіцыямі «У адзінстве наша сіла» і «Бессмяротны подзвіг крылатых герояў». Ён не знаходзіцца ў юрысдыкцыі Міністэрства культуры і працуе на базе сярэдняй школы, аднак факт яго з'яўлення адлюстроўвае палітычную важнасць тэмы. Некаторыя музеі выдаткоўваюць вельмі вялікія грошы на стварэнне адпаведных выстаў, як, напрыклад, Нацыянальны гістарычны музей у 2021 г. планаваў на сайце Дзяржзакупак выдаткі ў памеры 85 000 руб[13].

Варта адзначыць, што хаця Міністэрства культуры абавязвае праводзіць выставы да Дня народнага адзінства, але ў музеяў, прынамсі ў некаторых, яшчэ застаюцца магчымасці паўплываць на выбар уласна тэмы, прымеркаванай да падзеі, і стварыць дастаткова нейтральную выставу. Так, напрыклад, адбылося ў Мастацкім музеі. Яго віртуальная выстава «Заходняя Беларусь у мастацтве», якая праходзіла з 17.09.2021 г., дэманстравала тэматычныя відэанарысы па творчасці мастакоў Заходняй Беларусі. 16.09.2022 г. тамсама пачынае працу фізічная выстава жывапісных і графічных работ «Палітра Памяці» да Дня народнага адзінства. Экспануюцца творы юных мастакоў гімназіі № 75 г. Мінска, на якіх адлюстравана звычайнае жыццё. Выстава да Дня народнага адзінства Брагінскага гістарычнага музея з 10.03.2022 г. абвяшчала сваёй задачай «праілюстраваць поліэтнічнасць і поліканфесійнасць насельніцтва Беларусі».

# Трансфармацыя міжнароднага супрацоўніцтва

Катэгорыя «**Міжнародныя тэмы**» прадстаўлена музейна-экспазіцыйнай дзейнасцю, звязанай з наладжваннем замежных сувязяў з любымі краінамі, апрача Расійскай Федэрацыі. Апошняя вынесена ў асобную катэгорыю. Не зусім зразумела, ці існуе забарона на міжнароднае супрацоўніцтва для музеяў з боку беларускіх уладаў. Аднак замежныя партнёры пачалі перапыняць сувязі з беларускімі дзяржаўнымі арганізацыямі са свайго боку пасля пачатку вайны ва Украіне, калі спынілася фінансаванне ўсіх праектаў з ЕС.

Пільная ўвага да Польшчы непасрэдным чынам адбіваецца на дзейнасці музеяў. З мэтай унікнуць непажаданых сувязяў у 2022 г. не было праведзена ніводнай міжнароднай выставы з удзелам польскага боку. У тым жа годзе пад забарону патрапляе распрацаваны раней выставачны праект Ашмянскага музея: дэманстрацыя званоў ІІ Рэчы Паспалітай пад куратарствам польскага рэстаўратара П. Ямскога. Аднак яшчэ ў красавіку 2021 г. праходзіць выстава надгробка Яна Баршчэўскага, арганізаваная пры падтрымцы фонду Марыі Радзівіл.

У 2022 г. у экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці беларускіх музеяў не было супольных мерапрыемстваў і разам з украінскім бокам. Толькі адзін з музеяў пасля 24 лютага 2022 г. прыбраў са сваіх старонак інфармацыю пра выставу амбасады Украіны, прысвечаную вайне з Германіяй. Хутчэй за ўсё, гэта была прыватная ініцыятыва супрацоўніка, таму што на сайтах іншых музеяў звесткі пра гэтую выставу, дакладней іх шэраг, засталіся дагэтуль. Гэта фотадакументальныя выставы ў Віцебскім краязнаўчым музеі «Украіна ў Другой сусветнай вайне. 1939-1945» (з 23.04.2019 г.), Музеі бітвы за Днепр – «Нямецка-савецкая вайна: украінскі акцэнт» (з 15.09.2020 г.), Глыбокскім гісторыка-этнаграфічным музеі – «Нямецка-савецкая вайна 1939-1945 гг. Украінскі акцэнт» (з 04.08.2021 г.).

Другая частка выстаў у катэгорыі «Міжнародныя тэмы» прадстаўлена выставамі розных культурных напрамкаў, пры правядзенні якіх падкрэсліваецца фактар міжнароднага супрацоўніцтва – звычайна пры пасярэдніцтве адпаведных пасольстваў. Гэта выставы накшталт «Маем гонар прадставіць – Аванэс Туманян» (з 18.07.2019 г.) – прысвечаная армянскаму паэту. Праходзіла ў рамках Дамовы аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам культуры Беларусі і Міністэрствам культуры Арменіі. Трэцюю частку складаюць выставы, дзе адлюстроўваецца культура іншых краін вачыма беларусаў. 01.07.2022 г. адкрылася фотавыстаўка Ю. Міронава і В. Авакяна «Прыгожая краіна Японія».

Міжнародная тэматыка ў цэлым прадстаўлена адносна невялікай колькасцю выстаў: 122 пазіцыі, або 1,76% па суме ўсіх гадоў. У абсалютных лічбах іх колькасць змянялася зусім нязначна (каля 30 выстаў), але ў працэнтах гэта паніжэнне выглядае больш заўважным – з 2,38% да 1,71%. Захаванне агульнага ўзроўню забяспечваецца масівам выставак з удзелам дзяржаў СНД і краін

Усходу. У 2022 г. з 33 выстаў 11 былі звязаныя з Кітаем, Японіяй, Карэяй. Пры гэтым сустракаюцца выставы з нейтральнай тэматыкай, звязаныя з Заходняй Еўропай. Напрыклад, 03.03.2022 г. адкрылася фотавыстава Э. Літвіноўскага «Беларускі позірк Даўгаўпілса», арганізаваная сумесна з Цэнтрам беларускай культуры ў г. Даўгаўпілс. Яшчэ 20.10.2022 г. пачала працаваць беларуска-аўстрыйская выстава мастацкага тэкстылю «Windows & Bridges».

У катэгорыю «**Расія**» сабраныя выставы, якія праводзіліся сумесна з усходнім бокам, а таксама выставы, якія тым ці іншым чынам прадстаўлялі расійскую культуру і гісторыю. Агульная колькасць выстаў дадзенай катэгорыі складала 81 пазіцыю, або 1,17% за ўвесь разгледжаны час. Гэты вынік з'яўляецца даволі невялікім. Пры гэтым заўважна вырасла колькасць па гадах: з 13 пазіцый (0,88%) у 2019 г. да 33 (1,71%) – у 2022 г. У першую чаргу гэта адбылося за кошт прыросту выстаў у гістарычных і краязнаўчых музеях: па гадах з 2019 да 2022 гэта 3, 9, 13, 20 пазіцый.

Варта асобна адзначыць 7 выстаў у 2022 г., якія былі прысвечаны Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Напрыклад, у Мазырскім аб'яднаным краязнаўчым музеі 01.04.2022 г. пачала працаваць міні-выстаўка «Беларусь – Расія: саюз роўных». Пры гэтым у 2019-2021 гг. было толькі па 2 выставы на такую тэматыку, хаця сама святочная дата прызначана ажно з 1996 г.

У 2019 г. пераважала тэматыка братніх гарадоў або культуры і мастацтва. Напрыклад, выстава кніг «Пушкін і Беларусь. Пушкін і Польшча», прымеркаваная да 220-годдзя з дня нараджэння паэта, або «Мастацтва Палеха» з фондаў Дзяржаўнага музея Палехскага мастацтва. З 2021 г. сталі праяўляцца тэмы, звязаныя непасрэдна з уласна расійскімі палітычнымі падзеямі

і персонамі. З 03.12.2021 г. у музеі Вялікай Айчыннай вайны прайшла выстава «Бітва за Маскву. Бессмяротнасць подзвігу». 29.06.2022 працавала выстава ад Расійскага цэнтра навукі і культуры Брэста, прысвечаная 350-годдзю Пятра I.

Яшчэ адной новай тэндэнцыя, якая праявілася з 2021 г., стаў рост супрацоўніцтва з расійскімі рэгіянальнымі музеямі (Белгарадскі абласны музей, літаратурны Пензенскі, Разанскі музей, дзяржаўны музей «Смаленская крэпасць»[14]). Часткова такое збліжэнне было наступствам сыходу заходніх партнёраў. Працэс далейшага пашырэння супрацоўніцтва з расійскімі музеямі ўзмацніўся ў 2022 г., калі былі падпісаны дамовы з дырэкцыяй музеяў у Маскве, Барадзіне, Калінінградзе, Гагарыне, Гатчыне, Смаленску і інш.[15]

Супольныя праекты з расійскім бокам паспяхова рэалізуюцца. Перасоўная экспазіцыя на колах «Цягнік памяці» ў 2022 г. у тым ліку ўключала наведванне беларускімі і расійскімі школьнікамі шэрагу месцаў памяці Другой сусветнай вайны, якія знаходзіліся ў абедзвюх краінах.

# Непалітычныя выставы

Тэматыка «**Гісторыя штодзённасці**» склала 7,44%, або 517 пазіцый ад агульнага ліку. Сюды адносяцца размаітыя калекцыі побытавых прадметаў і з’яў, прадстаўленых шырокім часавым перыядам, які нельга вылучыць у асобную катэгорыю. Гэта такія выставы, як «Паштоўкі. Гісторыя і сучаснасць», выстава гадзіннікаў «Убачыць час», рэтракалекцыя «Прыгажосць і мода XX стагоддзя», выставы грошай розных часоў і краін, старых аўтамабіляў, навагодніх упрыгожанняў і інш. Унутры катэгорыі не назіралася зменаў кірунку падтэмаў.

Да катэгорыі «**Экалогія**» адносяцца выставы некамерцыйныя і камерцыйныя. Першыя прысвечаныя ахове навакольнага асяроддзя і тэарэтычным ведам аб прыродзе. Гэта такія выставы, як «Флора, якая знікае: 40 гадоў Чырвонай кнізе Беларусі», часовыя дыярамы «Прырода Міншчыны», фотавыстава «Чарнобыльскія джунглі», віртуальныя выставы да «Гадзіны Зямлі» і г. д. З 2021 г. знікаюць выставы, якія ладзіліся сумесна з арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (напрыклад, «Спаси орлёнка – птица 2019 года большой орлан» у Нацыянальным гістарычным музеі), якую Мінюст прызнаў экстрэмісцкай.

Другая група экалагічнай тэматыкі прадстаўленая перасоўнымі камерцыйна-забаўляльнымі пазнавальнымі выставамі, якія часцей за ўсё спалучаюць у сабе функцыю невялікага кантактнага заапарку. У 2019 г. была папулярнаю выстава «Свет малпаў». На працягу ўсяго перыяду сустракаюцца выставы «Свет вялікіх папугаяў і пеўчых птушак», «Парк пухнатых» (трусікі, яноты, малпы), «Ребятам о зверятах», а таксама выставы мінералаў і экзатычных інсектаў. Агульная колькасць выстаў на экалагічную тэматыку склала 484, або 7,01%. Лічба па гадах павялічылася з 85 пазіцый у 2019 г. да 156 – у 2021 г., а максімума дасягнула ў 2021 г.: 156 зафіксаваных выстаў.

Асноўнымі мэтамі экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музеяў, прадстаўленых у тэматыцы **краязнаўства**, з'яўляецца дакументальны або мастацкі аповед пра гісторыі краю, акрэслены больш шырокім часавым перыядам, чым прадстаўленыя ў іншых катэгорыях. Гэта можа быць расповед пра месца, яго ўстановы, знакавых персанаў рэгіёна, мясцовыя асаблівасці і традыцыі, якія не адносяцца да этнаграфічных, і іншыя характэрныя краязнаўчыя тэмы. Гэта такія мастацкія выставы, як «Полацк у творах сучасных мастакоў. Да 1160-годдзя Полацка» (з 20.05.2020 г.) або «Полацк на паштоўках XX стагоддзя» (з 15.05.2022 г.), фотавыставы: «Край палешукоў» (з 01.02.2019 г.) і «Спадчына Бешанковіцкага раёна. Да Міжнароднага дня помнікаў і мясцінаў» (з 15.04.2022 г.), успаміны месцічаў: «Гамяльчанка. Скрозь прызму ўспамінаў. Палац і парк ва ўспамінах, фотаздымках і дакументах Анжалікі Антонавай (Маланьінай)» (з 25.08.2022 г.), біяграфіі землякоў: педагог «Сцяпан Цімафеевіч Дзямешка» ў рамках праекта «Ганарымся нашымі землякамі» (з 16.03.2022 г.).

Пазіцыі тэматыкі краязнаўства выраслі колькасна з 83 у 2019 г. да 134 у 2022 г., аднак рост у працэнтах выглядае

не настолькі вялікім: з 5,63% да 6,94% адпаведна. Агульная лічба выстаў складае 399 штук (або 5,75%) з 6938.

Катэгорыя «**Рэлігія**» ў экспазіцыйна-выставачнай музейнай дзейнасці прадстаўлена пераважна мастацкімі творамі і абрадавымі атрыбутамі. Ёсць выставы, прымеркаваныя да рэлігійных святаў, у асноўным праваслаўных. Напрыклад, у снежні 2019 г. прайшла выстава «Заслаўскі спас – 2019», у красавіку 2022 г. – выстава «Абрадавыя святы. Вялікдзень» і інш. Таксама распаўсюджаныя дэманстрацыі збораў ікон і прадметаў культу: «Сабор святых. З фондаў гомельскага музея» (з 11.11.2021 г.) або «Цудатворная Казанская ікона ў камені» (з 09.12.2022 г.). Ушаноўваецца памяць асоб праваслаўнай царквы: у верасні 2022 г. прайшла выстава «Святасць зямлі беларускай», прысвечаная мітрапаліту Філарэту.

Пры гэтым мностве праваслаўных сюжэтаў выстаў, прысвечаных каталіцкай канфесіі, налічваецца 2-3 у год. У 2022 г. гэта былі: віртуальная выстава «AMOR LIBRORUMNOS UNIT. Нас яднае любоў да кніг», да 210-годдзя Полацкай езуіцкай акадэміі; аднадзённая экспазіцыя «Калегіюм езуітаў» на Ночы Музеяў і выстава «Нам з даўніны сівой касцёл святло даруе», да 235-годдзя касцёла Перамянення Пана ў Германавічах.

Цікавай з’явай стала перасоўная выстава аўтарскіх карцін Я. Сянько, якая аб’ядноўвае праваслаўныя і каталіцкія сюжэты, яна з поспехам праходзіла з 2019 па 2022 гг. Пры гэтым іншыя хрысціянскія канфесіі засталіся абыдзенымі ўвагай у экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музеяў. Асобным выпадкам выглядае выстава Брагінскага гістарычнага музея з карціннай галерэяй (з 10.03.2022 г.), якая была прымеркавана да Дня народнага адзінства, але мела на мэце прадэманстраваць поліканфесійнасць беларускага грамадства. Сярод іншых сустракаюцца выставы эклектычнай рэлігійнай скіра-

ванасці. 25.05.2020 г. запрацавала выстава шыцця А. Сідзельнікавай «Дарога да храма». У яе апісанні паведамляецца пра «сінтэз яскравага ўнутранага свету аўтара і архаічны свет старажытных вераванняў, легендаў і паданняў».

У колькасным вымярэнні рэлігійных выстаў стала на чвэрць больш з 2019 г., але ў працэнтах іх паказнік змяніўся нязначна: з 2,72% у 2019-м да 2,80% у 2022 г. Агульная лічба за ўсе гады складае 198 пазіцый, або 2,85%.

У катэгорыю «**Навука**» аб'яднаныя выставы двух кірункаў. Першы адлюстроўвае плён дзейнасці навукоўцаў («Іларыён Ігнаценка: 100 год у гісторыі») і аматараў навукі. Другі кірунак прадстаўляюць выставы, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца папулярызацыя навукі. Яны разлічаныя галоўным чынам на дзяцей і падлеткаў. Пераважна гэта камерцыйныя перасоўныя выставы, якія па чарзе наведваюць музей за музеем. Выстава «Нерэальная рэальнасць», якая прапаноўвала наведвальнікам убачыць 3D-карціны, здзейсніць віртуальнае падарожжа і скокі з парашутам, сустракаецца агулам 38 разоў за ўвесь час з 2019 па 2022 г. Па тым жа прынцыпе дзейнічалі гульнявая выстава «Планета дыназаўраў», «Музей эксперыментальных навук», інтэрактыўная выстава «Элементарыум» і іншыя. Колькасна ў гэтай катэгорыі не адбывалася вялікіх змен: каля 40 выстаў на год. Агульная доля складае 2.24%. Найбольшы працэнт (3,26%) назіраўся ў 2019 г. Хутчэй за ўсё, гэта тлумачыцца неабходнасцю шырока анансаваць менавіта камерцыйныя выставы.

**Музейная дзейнасць.** Выставы, прысвечаныя профільнай дзейнасці музейных устаноў, займаюць невялікую, але ўстойлівую долю (1.80%), каля 30 выстаў на год. Тут прадстаўлены выставы да ўгодак, новыя паступленні, экспазіцыі з фондаў. Тыповай для гэтага кшталту з'яўля-

ецца выстава «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль. 100 гадоў», дзе былі паказаны фотаздымкі, якія расказваюць пра галоўныя змены ў музеі, якія адбыліся цягам стагоддзя. Сюды ж адносяцца часовыя экспазіцыі, якія прадстаўляюць музей на мерапрыемствах: спецыялізаваных, такіх як, напрыклад, Нацыянальны форум «Музеі Беларусі», і агульных: раённых Дажынках і г. д. У 2019 г. былі выпадкі, калі выставы музея арганізаваліся па-за межамі краіны. Напрыклад, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» удзельнічаў у Міжнароднай выставе турыстычных паслуг «TT Warsaw 2019» у Варшаве. Пазней пра падобныя выпадкі не згадваецца.

Найменшая агульная колькасць пазіцый адносіцца да катэгорыі «**Спорт**»: 0.63%, або 44 з 6938 штук. У асноўным тут прадстаўлены нейтральныя па тэматыцы выставы пра асобныя мерапрыемствы, спецыялізаваныя ўстановы, гурткі і арганізацыі, землякоў-спартоўцаў. У 2022 г. прайшоў шэраг выставаў, дзе адзначаліся менавіта спартыўныя дасягненні ў гісторыі рэгіёна («Дзяржыншчына спартыўная», «Кругляншчына спартыўная» і г. д.). У канцы года адкрываюцца выставы, як у Мінскім абласным краязнаўчым музеі: «Беларусь адзіная, Беларусь спартыўная», дзе з'яўляецца некаторы акцэнт на ўспрыманне Беларусі як маналітнага арганізма.

Найбольшая колькасць спартовых выстаў (17 штук) фіксуецца ў 2019 г. З 2020 г. яна зменшылася амаль напалову, і пазней гэта прапорцыя захавалася. Відавочна, падзенне тлумачыцца тым, што менавіта ў 2019 г. у Беларусі праходзілі II Еўрапейскія гульні, і менавіта да іх прымяркоўваліся спецыяльныя музейныя мерапрыемствы, у тым ліку працавала міжнародная выстава «Спорт – гэта высокае мастацтва» ў рамках праекта «Еўрапейскія гульні – еўрапейскае мастацтва».

# Высновы

Размеркаванне тэм экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці ў музеях Беларусі паводле найбольшай сумарнай колькасці выстаў кожнай катэгорыі было прыблізна аднолькавым на працягу ўсяго разгледжанага перыяду з 2019 па 2022 г. Самай папулярнай была і засталася нейтральная тэматыка мастацтва і творчасці: 2361 выстава з 6938. Яна абганяе наступную катэгорыю больш чым у тры разы. Астатнія тэмы маюць колькасна менш заўважную розніцу паміж сабой. Агульны рэйтынг тэматык прадстаўлены наступным чынам у парадку змяншэння: мастацтва (любая творчасць), Вялікая Айчынная вайна, гісторыя штодзённасці, СССР, экалогія, дасавецкая гісторыя, краязнаўства, грамадзянскасць, патрыятызм, дзяржорганы, дзяржаўныя святы, рэлігія, этнаграфія і фальклор, беларуская мова і літаратура, навука, музейная дзейнасць, міжнародныя тэмы, генацыд беларускага народа, з'яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі, Расія, спорт.

Другой па папулярнасці ва ўсе гады заставалася тэма Вялікай Айчыннай вайны, прычым вызначэнне яе як «Другой сусветнай» цалкам знікла з назваў пасля 2019 г. Колькасць выстаў, прысвечаных вайне, застаецца вельмі

высокай і працягвае паволі расці да 2021 г., панізіўшыся, аднак, у 2022 г. праз з’яўленне канкурыруючай тэматыкі генацыду. Вялікая Айчынная вайна адсутнічае толькі ў экспазіцыйнай дзейнасці музеяў прыродазнаўчага профілю. Высокі паказнік агульнай колькасці (трэці сярод усіх) мае нейтральная тэматыка гісторыі штодзённасці, якая вырасла амаль напалову: са 100 выстаў у 2019 г. да 145 – у 2022 г. Прапарцыйна павялічылася і колькасць экспазіцый, прысвечаных Савецкаму Саюзу, большая частка якіх з’яўляецца па сваёй сутнасці краязнаўчымі.

Выставы, звязаныя з дасавецкай гісторыяй, колькасна павялічыліся з 97 да 123, але панізілася ў працэнтах з 6,59% да 6,37%. На працягу ўсіх гадоў сустракаюцца выставы, прысвечаныя Вялікаму Княству Літоўскаму і Рэчы Паспалітай. Аднак з 2022 г. адлюстраванне палітычных праяў гэтых перыядаў робіцца непажаданым. Застаюцца выставы, звязаныя са штодзённасцю ці тагачаснымі асобамі, якія падкрэслена разглядаюцца як прадстаўнікі беларускай нацыі. На прадстаўленасці гэтай катэгорыі найбольшым чынам адбіваецца працэс узрастання канфліктнасці гістарычнай памяці.

Колькасць выстаў з катэгорыі «Грамадзянскасць, патрыятызм, дзяржорганы і дзяржаўныя святы» перажылі скачок з 37 і 39 пазіцый у 2019-2020 гг. да 60 і 63 у 2021-2022 гг. Тэматыка не асабліва адрозніваліся па гадах. Для назваў характэрна выкарыстанне лозунгаў савецкага перыяду. У 2022 г. пачынаюць дзейнічаць перасоўныя выставы з пасылам да захавання незалежнасці Беларусі, што можа быць звязана з інтэнцыяй захавання суверэнітэту пасля пачатку вайны ва Украіне.

Ёсць шэраг тэматык, якім характэрна нязменнасць сюжэтаў на працягу перыяду, які мы разглядалі: этнаграфія і фальклор, спорт, краязнаўства. У катэгорыях «экалогія» і «навука» значны масіў прадстаўлены ка-

мерцыйнымі перасоўнымі выставамі з інтэрактыўнымі функцыямі. У выставах на рэлігійную тэматыку заўважна дамінуе праваслаўная канфесія.

Колькасць выстаў тэматыкі «Беларуская мова і літаратура» павялічылася з 2019 па 2021 гг. з 27 да 64, а ў 2022 г. панізілася да 48 пазіцый. Часцей за іншыя сустракаюцца выставы, прысвечаныя Я. Купалу, Я. Коласу, М. Багдановічу, І. Шамякіну. Некаторыя імёны (Л. Геніюш, Н. Арсеннева) пасля 2019 г. цалкам прапалі з музейнай прасторы. У 2022 г. знікаюць выставы, прысвечаныя асобам, рэпрэсаваным савецкай уладай, і В. Быкаву.

Нешматколькасная міжнародная тэматыка зменшылася з 2,38% да 1,71%. Супрацоўніцтва з заходнімі ўстановамі працягвалася, хоць і паступова змяншаючыся, яшчэ некаторы час пасля надыходу палітычнага крызісу ў Беларусі і перарвалася з пачаткам вайны ва Украіне. Асноўнымі замежнымі партнёрамі становяцца краіны Усходу і СНД. А самым заўважным з іх – Расія. З 2021 г. у беларускіх музеях значна павялічваецца колькасць дамоў аб супрацы з рэгіянальнымі расійскімі музеямі. Колькасць выстаў у катэгорыі «Расія» значна павялічваецца з 13 да 33 у 2022 г., хаця ў цэлым застаецца невялікай (81 пазіцыя за ўвесь перыяд). З 2021 г. з'яўляюцца тэмы, непасрэдна звязаныя з расійскімі палітычнымі падзеямі і персонамі. У 2022 г. заўважна расце колькасць выстаў, прысвечаных Дню яднання народаў Беларусі і Расіі.

Значна павялічылася колькасць выстаў на тэму ўз'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі: з 2 у 2019 г. да 39 і 49 у 2021 і 2022 гг. Абвешчаны ў 2021 г. Год народнага адзінства адпавядаў задачам умацавання дзяржавы перад абвешчанай чарговай пагрозай з боку калектыўнага Захаду. У тэматыцы выстаў адлюстроўваюцца антыпольскія настроі, вялікая ўвага надаецца Бяроза-Картузскаму лагеру. Яшчэ большы скачкападобны рост адбыўся з вы-

ставамі на тэму «Генацыд беларускага народа». Такая дэфініцыя з’яўляецца толькі ў 2021 г., тады ж адбываецца 4 выставы, якія ў 2022 г. пераўтварыліся адразу ў 113. Правесці тэматычную выставу была абавязана абсалютная большасць музеяў, акрамя прыродазнаўчых. Некаторыя ўстановы падышлі да выканання задачы зусім фармальна, але іншыя нават стварылі новыя пастаянныя экспазіцыі.

З 2021 г. пашыраецца практыка ўвядзення перасоўных экспазіцый і выкарыстання інтэрактыўных пляцовак для ўсіх тэм, якія адпавядаюць задачам умацавання ў грамадстве патрыятычных настрояў, у тым сэнсе, як гэта разумеюць беларускія ўлады: гэта Вялікая Айчынная вайна, генацыд беларускага народа, уз’яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі, часткова Расія, а таксама грамадзянскасць, патрыятызм, дзяржорганы і дзяржаўныя святы. Трэба адзначыць, што характар выстаў, прысвечаных вайне, генацыду і ўз’яднанню Беларусі, не заўжды адлюстроўвае менавіта ўра-патрыятычныя настроі. За ўсе гады здараліся выпадкі, калі музеі трактавалі гэтыя планавыя тэмы ў іншых ракурсах (як рэквіем, аповед пра штодзённасць і г. д.) або выконвалі задачу фармальна, праводзячы пад шыльдай ідэалагічна выверанай тэмы дастаткова нейтральныя па сюжэце мастацкія выставы.

У тэматыках экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музеяў Беларусі з 2019 па 2022 г. адбыўся шэраг зменаў якаснага і колькаснага характару, звязаных з палітычнымі падзеямі ў краіне і за яе межамі. Аднак некаторыя з’явы, характэрныя для музейнай дзейнасці ў 2019 г., застаюцца нязменнымі на працягу ўсяго перыяду. Гэта заўважная колькасная перавага мастацкай тэматыкі над усімі астатнімі, стабільна высокі ўзровень тэматыкі ВАВ і амаль дакладнае захаванне ранжыравання выстаў па колькасці, якое захоўвалася з года ў год. Найбольшы ўнутраны рост паказалі выставы на тэму генацыду белару-

скага народа (адсутныя да 2021 г.) і з’яднання Усходняй і Заходняй Беларусі. Гэтыя камемаратыўныя тэматыкі з’яўляюцца істотнымі для ўмацавання патрыятычных прадзяржаўных настрояў у грамадстве. Яны праяўляюцца не толькі ў часовых выставах, але ўбудоўваюцца ў пастаянныя музейныя экспазіцыі. З іншага боку, агульная колькасць выстаў у гэтых катэгорыях засталася невысокай адносна іншых, перагнаўшы толькі катэгорыі Расіі і спорту. Колькасць выстаў на тэматыку, звязаную з Расіяй, паволі расце, але ўсё адно застаецца нізкай. З 2021 г. з’яўляюцца выставы, прысвечаныя Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, працягваючы курс на зблiжэнне паміж дзвюма краінамі. За разгледжаны перыяд павялічылася колькасць выстаў на тэму Вялікай Айчыннай вайны і гісторыі штодзённасці. Нязначна выраслі тэмы экалогіі, дасавецкай гісторыі і краязнаўства, «Грамадзянскасць, патрыятызм, дзяржорганы, дзяржаўныя святы», рэлігіі, этнаграфіі і фальклору, беларускай мовы і літаратуры. Фактычна на адным узроўні засталася катэгорыя музейнай дзейнасці. Нязначна, але зменшылася колькасць выстаў пра навуку, спорт і на міжнародную тэматыку.

---

[1] Спасылка

[2] Спасылка

[3] Спасылка

[4] Спасылка

[5] Спасылка

[6] Спасылка

[7] Спасылка

[8] Спасылка

[9] Спасылка

[10] Спасылка

[11] Спасылка

[12] Спасылка

[13] Спасылка

[14] Спасылка